**Карасцінская Н.У.,**
аспірантка кафедры
бібліяграфіі і дакументазнаўства

# І.Б. СІМАНОЎСКІ І СУЧАСНЫЯ ПРАБЛЕМЫ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ БІБЛІЯГРАФІІ

Навуковая распрацоўка сістэмы бібліяграфічнай інфармацыі, класіфікацыя яе па відах, функцыянальная структура, аб'ект, погляды на статус і сутнасць бібліяграфіі цалкам, г. зн. усё тое, чаму І.Б.Сіманоўскі надаваў многа ўвагі ў сваёй дзейнасці на пасадзе дырэктара Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І.Леніна і Кніжнай палаты, у сваіх шматлікіх працах, і сёння не страціла навуковай і практычнай значнасці.

Сапраўды, І.Б.Сіманоўскі неаднаразова ставіў пытанне аб каардынацыі бібліяграфічнай дзейнасці паміж рэспубліканскімі і рэгіянальнымі бібліятэкамі, універсальнымі, шматгаліновымі і галіновымі навуковымі бібліятэкамі, аб аднаразовай бібліяграфічнай апрацоўцы дакументаў, адной з задач якой з'яўляецца арганізацыя цэнтралізаванай каталагізацыі ў рэспубліцы. Цяпер навуковыя бібліятэкі Рэспублікі Беларусь разам з фондам фундаментальных даследаванняў працуюць над стварэннем у Беларусі цэнтра карпаратыўнай каталагізацыі. Гэта дазволіць скараціць затраты на каталагізацыю; забяспечыць інфармацыйную і лінгвістычную сумяшчальнасць; ліквідаваць дубліраванне працы па апрацоўцы выданняў у розных бібліятэках. Але стварыць цэнтр карпаратыўнай каталагізацыі нельга без распрацоўкі нацыянальнага абменнага фармату. У Беларусі створана рабочая група з вядучых спецыялістаў у галіне каталагізацыі. Пры распрацоўцы нацыянальнага фармату Беларусі арыенцір узяты на адаптацыю міжнароднага камунікатыўнага фармату UNIMARC.

Репозиторий БГУКИ

Закранаў І.Б.Сіманоўскі і пытанні, якія датычацца такой значнай праблемы, як цэнтралізацыя і дэцэнтралізацыя. У сферы бібліяграфічнай дзейнасці і сёння ўзаемадзейнічаюць гэтыя два супярэчлівыя прынцыпы. Па сутнасці, у Беларусі складіся нацыянальныя бібліяграфічныя цэнтры (Нацыянальная кніжная палата, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, рэспубліканскія галіновыя, абласныя бібліятэкі), але прынцып цэнтралізацыі можна выкарыстаць толькі ў адным працэсе бібліяграфічнай дзейнасці — бібліяграфаванні. Што датычыць працэсу бібліяграфічнага абслугоўвання, то ён увогуле павінен быць дэцэнтралізаваным. А на сучасным этапе сродкі аўтаматызацыі і камунікацыі дазваляюць атрымліваць інфармацыю карыстальнікам непасрэдна на рабочым месцы або па месцы пражывання.

Каардынацыя, кааперацыя бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк Беларусі на сучасным этапе забяспечваецца Беларускай бібліятэчнай асацыяцыяй, якая была заснавана ў чэрвені 1992 г. У яе склад уваходзіць камітэт па бібліяграфічнай дзейнасці. Асноўная яго мэта — садзейнічаць развіццю сістэмы бібліяграфічнага забеспячэння інфармацыйных патрэб грамадства Беларусі шляхам аб'яднання намаганняў усіх бібліятэчных цэнтраў рэспублікі.

Акрамя глабальных праблем сістэмы бібліяграфічнай інфармацыі, у працах І.Б.Сіманоўскага мы знаходзім шэраг прапаноў па ўдасканаленні асобных відаў ці працэсаў бібліяграфічнай дзейнасці. Напрыклад, метад сумяшчэння рэпертуарнай нацыянальнай бібліяграфіі і зводных каталогаў, прапанаваны І.Б.Сіманоўскім, стаў перспектыўным, бо па такім шляху пайшло цяпер развіццё гэтага віду бібліяграфіі. Шырокае ўяўленне І.Б.Сіманоўскага аб бібліяграфічным метадзе праз шмат гадоў знайшло падтрымку ў працах М.Г. Вохрышавай і Н.А.Сляднёвай. У сваёй манаграфіі “Бібліяграфія ў сістэме універсума чалавечай дзейнасці” (М., 1993) Н.А.Сляднева

разглядае прымяненне бібліяграфічнага метаду ў розных галінах чалавечай дзейнасці.

Прагрэсіўнымі з'яўляюцца і ўяўленні І.Б. Сіманоўскага аб аб'екце бібліяграфіі, да якога ён адносіў не толькі друкаваныя творы, але і рукапісныя, іншыя сацыяльна значныя дакументы. У наш час Нацыянальная бібліятэка Беларусі вядзе працу па фарміраванні базы даных рэдкіх кніг і рукапісаў.

Ёсць прыклады адлюстравання рукапісных матэрыялаў і ў галіновых дапаможніках. Так, у паказальніку "Асвета і педагагічная думка ў Беларусі са старажытнасці да пачатку XX ст.", складзеным калектывам аўтараў і надрукаваным Нацыянальным інстытутам адукацыі Рэспублікі Беларусь, упершыню змяшчаецца вялікі інфармацыйны масіў архіўных дакументаў і друкаваных крыніц па педагогіцы.

Атрымліваць інфармацыю з мэтай адукацыі, навуковай і практычнай дзейнасці — гэта права чалавека, замацаванае ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і ў канстытуцыях большасці краін (і Беларусі таксама). Кожная бібліятэка павінна імкнуцца да вырашэння трох асноўных задач па рэалізацыі доступу да інфармацыі. Па-першае, з дапамогай камп'ютэраў і іншых сродкаў тэлекамунікацый павысіць якасць доступу чытачоў да інфармацыйных рэсурсаў сваёй бібліятэкі; па-другое, уключыць рэсурсы бібліятэкі ў рэгіянальныя (нацыянальныя) і міжнародныя базы даных; па-трэцяе, забяспечыць аддалены доступ да рэгіянальных, нацыянальных і міжнародных баз даных сваім карыстальнікам.

Сучасная інфармацыйная сітуацыя, якая склалася ў Рэспубліцы Беларусь пад уздзеяннем знешніх макрафактараў, такіх як разбурэнне СССР і абвяшчэнне ў 1990 г. Беларусі суверэннай дзяржавай, дэмакратызацыя ўсёй сферы сацыяльна-культурнага жыцця, пераход да рынчных адносін, адраджэнне нацыянальнай культуры, інфарматызацыя грамадства і іншыя, патрабуюць унясення пэўных карэктыў у падыходы і тэхналогію бібліяграфічнай дзейнасці, якія былі прапанаваны ў свой час І.Б.Сіманоўскім.

Рэпазіторый БГУКІ

Нацыянальная сістэма бібліяграфічнай інфармацыі ў Рэспубліцы Беларусь, як і ў іншых краінах, уключае два ўзроўні: агульны (універсальны) і спецыяльны (галіновы), якія ўзаемадзейнічаюць паміж сабой.

На універсальным узроўні асаблівая ўвага надаецца бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі, пытаннямі якой заўсёды займаўся і І.Б. Сіманоўскі. У рэспубліцы створаны і працуе бібліяграфічны цэнтр, які адказвае за вядзенне бягучай нацыянальнай бібліяграфіі — Нацыянальная кніжная палата Беларусі.

Што датычыцца рэтраспектыўнай нацыянальнай бібліяграфіі, то трэба адзначыць, што ў Нацыянальнай бібліятэцы пачалася работа па стварэнні баз даных нацыянальных дакументаў. Але існуе шмат праблем, напрыклад, яшчэ не вырашана пытанне з апісаннем беларускіх рукапісаў. Работа па фарміраванні базы даных "Рэдкая кніга і рукапісы" пачалася, але пакуль што яна вядзецца толькі з фондамі аддзела рэдкай кнігі і рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Шмат увагі І.Б.Сіманоўскі надаваў і спецыяльнай (навукова-дапаможнай і рэкамендацыйнай) бібліяграфіі. Але традыцыйнымі метадамі, якія ў свой час ён прапаноўваў, нельга вырашыць усіх праблем, што стаяць перад сістэмай галіновай бібліяграфіі на сучасным этапе. Укараненне найноўшых камп'ютэрных тэхналогій, сродкаў тэлекамунікацый дае магчымасць вырашыць такія фундаментальныя праблемы галіновай сістэмы бібліяграфічнай інфармацыі, як стварэнне эфектыўных галіновых бібліяграфічных сістэм, якія больш паглыблена і шматаспектна раскрывалі б лакальныя, рэгіянальныя і нацыянальныя інфармацыйныя рэсурсы, забяспечвалі б доступ да міжнародных і замежных інфармацыйных рэсурсаў, а таксама прадстаўлялі інфармацыйныя рэсурсы бібліятэкі ў папулярных міжнародных базах даных.

На сучасным этапе рэспубліканскія галіновыя навуковыя бібліятэкі і некаторыя бібліятэкі спецыяльныя (нізавога ўзроўню) стварылі аўтаматызаваныя электрон-

Рэпазіторый БГУКІ

ныя каталогі і базы даных, якія значна пашырылі спектр семантычнага і адрасна-фармальнага пошуку інфармацыі аб дакументах. Напрыклад, Цэнтральная навуковая бібліятэка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі вядзе электронны каталог, галіновую базу даных “Прырода Беларусі”, Рэспубліканская навукова-тэхнічная бібліятэка — базу даных “Эканоміка” і інш.

Зараз адбываецца абмен бібліяграфічнай інфармацыяй па культуры і мастацтве, новымі паступленнямі нацыянальных дакументаў па электроннай пошце паміж Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і Магілёўскай, Віцебскай абласнымі бібліятэкамі.

Доступ да міжнародных і замежных баз даных можна ажыццяўляць двума шляхамі: па-першае, гэта іх набыццё, а па-другое, з дапамогай сродкаў тэлекамунікацый (доступ да апошніх у рэжыме тэледоступу, ці так званай віртуальнай інфармацыі). У даведачна-інфармацыйным аддзеле Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў снежні 1996 г. быў устаноўлены камп’ютэр для работы з кампакт-дыскамі CD—ROM, на адным з якіх прадстаўлены каталог бібліятэкі Кангрэса ЗША.

Самай вялікай з існуючых на сённяшні дзень камп’ютэрных сетак з’яўляецца Internet. Аддалены доступ (Telnet) дае магчымасць пры дапамозе вызначанага набору камандаў падключыцца да аддаленага камп’ютэра і працаваць з ім у інтэрактыўным рэжыме, забяспечвае доступ да мноства адкрытых сервераў, уключаючы бібліятэчныя каталогі і базы даных.

У сучасны момант у тэрмінасістэму бібліяграфазнаўства і сумежных навук настойліва ўкараняецца прыметнік “віртуальны”. Так, В.К.Сцяпанаў уводзіць такое паняцце, як “віртуальны даведачна-бібліяграфічны апарат”. Мы мяркуем, што цяпер можна з поўным правам гаварыць аб віртуальнай бібліяграфічнай інфармацыі.

Важнейшай умовай інфарматызацыі грамадства з’яўляецца забеспячэнне доступу да інфармацыі, стварэнне адзінай інфармацыйнай прасторы ў межах адной краіны і

ў свеце ў цэлым. Яе неабходнасць абумоўлена ўсё ўзрастаючым патокам дакументаў, іх падаражаннем, што патрабуе кааперацыі ў задавальненні інфармацыйных патрэб, і сусветнай тэндэнцыяй да інтэграцыі ва ўсіх сферах жыцця чалавека.

Беларусь можна аднесці да разраду краін, якія выдаюць адносна малы інфармацыйны паток. Але працы вучоных, пісьменнікаў, дзеячаў культуры Беларусі не толькі з'яўляюцца нацыянальным здабыткам, але і павінны ўвайсці ў сістэму сусветных каштоўнасцей. У сусветную інфармацыйную прастору яны трапяць толькі ў тым выпадку, калі звесткі аб дзейнасці і працах беларускіх вучоных будуць уключаны ў папулярныя міжнародныя базы даных, якія маюць шырокае распаўсюджванне. Дзеля таго каб структура інфармацыйных рэсурсаў адпавядала інфармацыйным патрэбам, неабходна ведаць гэтыя патрэбы, сачыць за дынамікай іх змен, прагназіраваць іх далейшае развіццё.

Канец XX ст. характарызуецца новымі фактарамі. Адбываюцца не толькі паскарэнне і імклівае павелічэнне патоку інфармацыі, але і якасны працэс змянення ўсёй глыбіннай структуры інфармацыйнай сістэмы, ва ўсё большай ступені вызначаючы дзейнасць чалавека, разнастайнасць яго інтарэсаў і меркаванняў.

Можна дакладна сказаць, што бібліяграфія, г. зн. другасная інфармацыя аб дакументах (рукапісных, паліграфічных або электронных), безумоўна, захавае сваё месца ў інфармацыйнай дзейнасці незалежна ад дасягненняў будучыні.

Репозиторий БГУКИ